# Прамова старшыні Совета Народных Камісараў БССР дэпутата тав. Кісялёва К. В.

Таварышы дэпутаты Вярхоўнага Совета Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі!

2-га лістапада 1939 г., у гэты гістарычны дзень, Унечарговая Пятая Сесія Вярхоўнага Совета СССР слухала заяву Поўнамоцнай Камісіі Народнага Сабрання Заходняй Беларусі і пастанавіла: задаволіць просьбу Народнага Сабрання Заходняй Беларусі і ўключыць Заходнюю Беларусь у састаў Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік са з'яднаннем яе з Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікай.

Дазвольце ад імені ўрада БССР, ад імені працоўных Совецкай Беларусі павіншаваць вас, членаў Поўнамоцнай Камісіі Народнага Сабрання Заходняй Беларусі, а ў вашай асобе ўсіх працоўных Заходняй Беларусі, з вызваленнем вас нашай доблеснай Чырвонай Арміяй ад іга польскіх памешчыкаў і капіталістаў.

Таварышы дэпутаты! Мы слухалі заяву Поўнамоцнай Камісіі Народнага Сабрання Заходняй Беларусі з просьбай прыняць Заходнюю Беларусь у састаў Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі. Гэтая заява Поўнамоцнай Камісіі Народнага Сабрання выражае ісціную волю і жаданне народаў Заходняй Беларусі.

У адпаведнасці з просьбай Поўнамоцнай Камісіі Народнага Сабрання Заходняй Беларусі і законам «Аб уключэнні Заходняй Беларусі ў састаў Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік са з'яднаннем яе з Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікай» Унечарговай Трэцяй Сесіі Вярхоўнага Совета БССР прадстаіць вырашыць гістарычнае пытанне аб прыняцці Заходняй Беларусі ў састаў Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі.

Польскія паны, адарваўшыя 20 год таму назад ад рэволюцыйнай Расіі землі беларускія і украінскія, падвяргалі самай жорсткай эксплаатацыі і нацыянальнаму прыгнечанню народы, насяляючыя гэтыя землі. 20 год, змрочных і страшных год, народ Заходняй Беларусі быў адорван ад сваіх адзінакроўных братоў, ад шчаслівага народа Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі.

Адчуваючы побач з усімі працоўнымі былой польскай дзяржавы цяжкую эксплаатацыю, эканамічнае разарэнне, беларусы і украінцы апрача таго падвяргаліся бесчалавечнаму нацыянальнаму гнёту, ганенням, здзекам і гвалту. Пазбаўленыя права гаварыць на сваёй роднай мове, яны падвяргаліся гвалтоўнаму апалячванню, пазбаўляліся ўсякіх чалавечых праў, цярпелі знявагі, марнелі.

Заходняя Беларусь была поўкалоніяй польскай буржуазіі, культываваўшай яшчэ феадальна-памешчыцкія традыцыі.

Польская шляхта наўмысля тармазіла развіццё прамысловасці на тэрыторыі Заходняй Беларусі.

Эксплаатацыя рабочых дасягала крайніх межаў. Сяляне Заходняй Беларусі былі зацісныты ў страшэнныя ціскі беззямелля, нястачы і беспраўя. Многія дзесяткі тысяч сялянскіх двароў зусім не мелі зямлі і цягла. Са смуткам і слязьмі глядзелі беларускія сяляне на прыгожыя азёры, пасьбішчы і лясы, якія яны бязмежна любілі, але якія былі захвачаны ненавіснымі памешчыкамі.

Працоўны селянін не мог беспакарана ступіць на панскую зямлю, якая па праву павінна была належаць народу. За галінку, зламаную ў памешчыцкім лесе, селяніна збівалі панскія леснікі. Калі карова выпадкова трапляла на памешчыцкае поле, селяніна штрафавалі, а карову забіралі панскія наймiты.

Сяляне жылі ў курных хатах, пры лучыне, карыстанне лямпай было раскошшу. Яны не маглі купіць запалак, солі, цукру.

Польскія капіталісты і памешчыкі грамілі беларускую культуру. Родная беларуская мова была прагнана са школ. Усе беларускія школы былі закрыты, нацыянальная чэсць беларускага народа зняважана, яго культура ўтаптана ў гразь паліцэйскім ботам.

Сотні тысяч рабочых і сялян Заходняй Беларусі былі непісьменнымі. Вёска пазбаўлена была ўсякай медыцынскай дапамогі.

Заходняя Беларусь—гэта быў край сацыяльнага і нацыянальнага прыгнечання. Жабрацтва, голад, беспрацоўе былі адвечнымі спадарожнікамі працоўных Заходняй Беларусі. Якіх толькі зняваг не перацярпелі працоўныя народы Заходняй Беларусі! Але гісторыя свабодалюбівага украінскага і беларускага народаў мае гераічныя старонкі барацьбы з польскай шляхтай. Польскія паны злобна помсцілі працоўным Заходняй Беларусі за кожную іх спробу паўстаць, вырвацца з панскага хамута. Але не можа быць моцнай жыццездольнай дзяржава, якая трымала цэлыя народы на становішчы каланіяльных рабоў. Доказам гэтаму служыць імклівы распад былой панскай Польшчы.

Беларусь да Кастрычніцкай рэвалюцыі з'яўлялася каланіяй рускага царызма, адсталай нацыянальнай «акраінай», амаль не мела буйнай прамысловасці. Дробная саматужная прамысловасць займала ў валавой прадукцыі 70 проц. Вельмі паказальны «пункт погляду» царскіх заправіл на пытанне аб развіцці прамысловасці ў Беларусі. Захаваліся дакументы, у якіх прама ўказвалася, што «развіццё і стварэнне прамысловых цэнтраў у заходнім краі, неспакойным, блізкім да заходняй дзяржаўнай граніцы, непажадана».

У рэзультаце такіх установак прыродныя багацці краіны трымаліся пад спудам або варварскі разбазарваліся. Драмала творчая думка. Лічылася за лепшае нажываць барышы на бесчалавечнай эксплаатацыі працоўных мас.

Зусім іншае становішча мы маем зараз у Беларускай Совецкай Социялістычнай Рэспубліцы.

Няўхільнае правядзенне ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі, велізарная дапамога, нястомныя клопаты нашай партыі і асабіста таварыша Сталіна (працяглыя апладысменты) забяспечылі індустрыяльнае развіццё нацыянальных рэспублік і абласцей, быстры рост іх эканомікі і культуры, нацыянальнай па форме і соцыялістычнай па зместу.

Беларусь з былой калоніі царскай Расіі, з краіны непраевных да-

рог, адсталасці, непісьменнасці, забітасці, страшэннага жабрацтва і беспраўя, з краіны, дзе голад, кашмарныя эпідэміі—калтун, трахома і інш. хваробы—былі спадарожнікамі працоўных,—за гады совецкай улады, пад кіраўніцтвам партыі большэвікоў, пад асабістым і непасрэдным кіраўніцтвам таварыша Сталіна (**працяглыя апладысменты**), пры брацкай дапамозе рускага рабочага класа і працоўных усяго Совецкага Саюза, у барацьбе з ворагамі народа,—ператварылася ў Беларускую Совецкую Соцыялістычную Рэспубліку, у індустрыяльна-калгасную квітнеючую ордэнаносную рэспубліку. (**Апладысменты**). Няма неабходнасці прыводзіць мноства прыкладаў і цыфр для ілюстрацыі гэтага становішча. Дастаткова ўказаць толькі некаторыя з іх.

Асноўныя фонды прамысловасці за дзве сталінскія пяцігодкі павялічыліся больш чым у 9 раз. У 1938 г. удзельная вага прамысловай прадукцыі ўзрасла да 79,6 процанта. За 9 месяцаў 1939 года прадукцыя ўсіх прамысловых наркаматаў павялічылася ў параўнанні з тым-жа перыядам мінулага года на 8,7 процанта.

Здабыча торфу супроць дарэволюцыйнай павялічылася ў 180 раз, выпрацоўка электраэнергіі—у 100 раз супроць 1913 года. Такія наркаматы як Наркамлегпром, Наркамхарчпром, Наркаммясцпром БССР датэрмінова выканалі 10-месячную праграму 1939 года. Рост прадукцыйнасці працы ў прамысловасці БССР за гады двух сталінскіх пяцігодак складае 65 проц. Вельмі важна адзначыць, што прырост прамысловай прадукцыі ў другой пяцігодцы пакрываўся на $^3/_4$ за кошт павелічэння прадукцыйнасці працы і толькі на $^1/_4$ за кошт колькаснасці рабочай сілы.

Сельская гаспадарка дарэволюцыйнай Беларусі была надзвычай адсталай. Выпустошаныя, няўгнойваемыя палоскі зямлі давалі нізкі ўраджай. Прымітыўнай сахою не мог пракарміцца труженік. Недаяданне было звычайнаю з'явай у беларускай вёсцы. Усе лепшыя землі знаходзіліся ў памешчыкаў: 64,8 процанта ўсіх зямель належала ім і толькі 35,2 процанта належала сялянам, прычым 12 процантаў кулацкіх гаспадарак трымалі ў сваіх руках 38 процантаў усёй зямлі сялянскага ўладання. Голад і холад гналі сотні тысяч труженікаў на пошукі лепшага жыцця.

Такі бязрадасны малюнак прадстаўляла сабой беларуская дарэволюцыйная вёска.

Многа песень, легенд і паданняў склаў беларускі народ аб годах цяжкіх пакут. У людзей вякамі расла мара «аб залатой волі, аб шчаслівай долі». І гэтая мара збылася. Шчаслівае, заможнае і культурнае жыццё беларускія сяляне набылі пры совецкай уладзе, дзякуючы калгаснаму ладу. Вялікая Кастрычніцкая соцыялістычная рэволюцыя дала беларускаму сялянству ў працоўнае карыстанне звыш 8 мільёнаў гектараў зямлі. У выніку ажыццяўлення 2-га пяцігадовага плана сельская гаспадарка БССР, як і ўсяго Совецкага Саюза, прадстаўляе сабой буйную механізаваную соцыялістычную гаспадарку ў выглядзе соўгасаў, МТС і калгасаў.

К сучаснаму моманту ў БССР 91 процант сялянскіх гаспадарак аб'яднаны ў калгасы, якія займаюць 97 процантаў пасеўнай плошчы.

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы